# КОДЭКС ЭТЫКІ
# БЕЛАРУСКАЙ АСАЦЫЯЦЫІ
# АДВАКАТАЎ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

*(Са змяненнямі, прынятымі рашэннем Агульнага Сходу ад 15 снежня 2023 года)*

Усведамляючы каштоўнасць правоў чалавека і асноўных свабод,

прымаючы да ўвагі неабходнасць абароны правоў і свабод чалавека не толькі ўладай закона, але і незалежнай супольнасцю адвакат_ак як часткай любога дэмакратычнага грамадства,

улічваючы, што абарона гэтых правоў і свабод мае вялікае значэнне для захавання прынцыпу вяршэнства права і з'яўляецца місіяй любой супольнасці незалежных адвакат_ак,

усведамляючы высокія патрабаванні да юрыдычнай прафесіі,

адзначаючы неабходнасць забеспячэння свабоды і незалежнасці прафесійнай дзейнасці юрыст_ак па прасоўванні і абароне правоў чалавека,

мы - Беларуская асацыяцыя адвакатаў правоў чалавека - прымаем Кодэкс этыкі Беларускаяй Асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека (далей - Кодэкс).

Кодэкс грунтуецца на міжнародных стандартах, якія тычацца ролі адвакат_ак і праваабаронцаў, перш-наперш на Асноўных прынцыпах аб ролі юрыст_ак, Дэкларацыі аб праве і абавязках асоб, груп і органаў грамадства заахвочваць і абараняць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды і адпавядаюць прафесійным правілам міжнародных асацыяцый адвакат_ак[1] і Прынцыпамі дзейнасці праваабаронцаў Беларусі.

Кодэкс замацоўвае адзіную сістэму прафесійных і этычных прынцыпаў для адвакат_ак правоў чалавека і этычных правіл, абавязковых для выканання сябр_оўкамі Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека згодна з яе місіяй.

---

[1] Стандарты незалежнасці юрыдычнай прафесіі міжнароднай асацыяцыі юрыстаў, Агульны кодэкс правіл для адвакатаў краін Еўрапейскай супольнасці і іншыя.

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### 1.1. Адвакат_ка правоў чалавека

Адвакат_ка правоў чалавека - гэта юрыст_ка (незалежна ад наяўнасці статуса адвакат_кі ў пэўнай дзяржаве), якая/які прытрымліваецца агульнапрызнаных міжнародных этычных стандартаў юрыдычнай прафесіі, валодае кампетэнцыямі ў галіне абароны правоў чалавека і асноўных свабод і аказвае юрыдычную дапамогу асобам, якія па яе звяртаюцца (кліент_кам), на аснове міжнародных стандартаў правоў чалавека, у тым ліку ў нацыянальных судах і ў міжнародных органах, а таксама іншымі спосабамі прасоўвае і абараняе правы чалавека.

### 1.2. Мэта Кодэкса

Мэтай дадзенага Кодэкса з’яўляецца стварэнне ўмоў, якія забяспечваюць належнае выкананне адвакат_камі правоў чалавека сваіх прафесійных абавязкаў перад кліент_камі, правасуддзем і грамадствам, абарону сам_ой адвакат_кі, эфектыўнае функцыянаванне Асацыяцыі, а таксама фармаванне даверу да статусу адвакат_кі правоў чалавека і прызнання гэтага статусу прафесійнымі аб'яднаннямі адвакат_ак, праваабаронцаў і дзяржавамі.

### 1.3. Сфера ўжывання.

Дадзены Кодэкс абавязковы для сябр_овак Асацыяцыі і адкрыты да далучэння адвакат_камі правоў чалавека, якія добраахвотна пацвердзілі пыхільнасць да яго прынцыпаў і гатоўнаць іх выконваць.

## 2. ПРЫНЦЫПЫ ДЗЕЙНАСЦІ АДВАКАТ_АК ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

### 2.1. Прыхільнасць да ідэі ўніверсальнасці правоў чалавека

Адвакат_кі правоў чалавека з'яўляюцца прыхіль_ніцамі ідэі ўніверсальнасці правоў чалавека, лічаць, што ўсе правы чалавека і асноўныя свабоды ўніверсальныя, непадзельныя, узаемазалежныя і ўзаемазвязаныя і павінны заахвочвацца і ажыццяўляцца на справядлівай і раўнапраўнай аснове без усялякай дыскрымінацыі і шкоды для ажыццяўлення кожнага з гэтых правоў і свабод.

Адвакат_кі правоў чалавека не прымаюць у сваёй дзейнасці дыскрымінацыйных падыходаў, дзеянняў або выказванняў у адносінах да любых людзей ці груп.

### 2.2. Незалежнасць і самастойнасць

Адвакат_кі правоў чалавека дзейнічаюць абсалютна незалежна, у адсутнасці якога-небудзь уплыву на яе/яго, у тым ліку ў сувязі з асабістай зацікаўленасцю або ціскам звонку. Адвакат_цы правоў чалавека варта строга

захоўваць сваю незалежнасць, пазбягаць якога-небудзь яе ўшчамлення і не адмаўляцца ад прынцыпаў прафесійнага абавязку дзеля любых іншых інтарэсаў.

Адвакат_кі правоў чалавека самастойна вызначаюць дапушчальныя характар, формы і ступень узаемаадносін з рознымі дзяржавамі, іх службовымі асобамі, палітычнымі партыямі і іншымі суб'ектамі, прыватнымі кампаніямі і іншымі інстытутамі, у тым ліку міжнароднымі, замежнымі і нацыянальнымі арганізацыямі.

**2.3. Годнасць, добрасумленнасць.**

Адвакат_ка правоў чалавека павін_на заўсёды прытрымлівацца самых высокіх стандартаў добрасумленнасці і справядлівасці ў дачыненні да сваіх кліент_ак, суду, калегаў і ўсіх тых, з кім адвакат_ка уступае ў прафесійны кантакт. Адвакат_ка правоў чалавека не павін_на рабіць нічога, што наносіць шкоду яе/яго рэпутацыі або даверу грамадства да прафесіі адвакат_кі.

Адвакат_ка правоў чалавека павін_на добрасумленна, кваліфікавана, прынцыпова выконваць свае абавязкі. Пры гэтым адвакат_кі прытрымлівацца заканадаўства, якое не супярэчыць міжнародным стандартам.

**2.4. Канфідэнцыяльнасць**

Адвакат_ка правоў чалавека павін_на захоўваць канфідэнцыйнасць інфармацыі, якая становіцца вядомай у працэсе аказання юрыдычнай дапамогі кліент_кам, уключаючы факт звароту, інфармацыю аб асобах, якія звярнуліся па дапамогу, і іх персанальныя дадзеныя, а таксама аб'ём і формы дапамогі і іншую інфармацыю, якая перадаецца на ўмовах невыкрыцця.

На абавязак захавання прыватнасці не распаўсюджваецца дзеянне тэрміну даўнасці.

Адвакат_кі правоў чалавека зыходзяць з таго, што дзяржава не павінна ўмешвацца ў прафесійную дзейнасць адвакат_ак правоў чалавека і абавязана гарантаваць канфідэнцыйнасць зносін іх з тымі, каму яны аказваюць прававую дапамогу.

**2.5. Інтарэсы кліент_кі**

Павага чалавечай годнасці, падтрыманне і абарона правоў чалавека з'яўляецца найвышэйшай каштоўнасцю ў дзейнасці адвакат_кі правоў чалавека. Адвакат_ка правоў чалавека ў сваёй дзейнасці кіруецца інтарэсамі кліент_кі. Інтарэсы кліент_кі маюць прыярытэтнае значэнне, пры ўмове, калі яны не ствараюць перашкодаў у выкананні абавязкаў адвакат_кі прытрымлівацца заканадаўства, якое не супярэчыць міжнародным стандартам.

Дзеянні па абароне правоў і законных інтарэсаў не павінны ставіць пад пагрозу бяспеку кліент_кі і яе/яго блізкіх, у тым ліку ва ўгоду вырашэння сістэмных праваабарончых пытанняў альбо асабістых амбіцый адвакат_кі.

Адвакат_ка правоў чалавека з павагай ставіцца да сумневаў кліент_кі і забяспечвае кліент_ку поўнай і аб'ектыўнай інфармацыяй, якая дазваляе ёй/яму прыняць усвядомленае рашэнне.

Адвакат_ка правоў чалавека не павін_на асацыявацца з кліент_кай.

## 2.6. Недапушчальнасць канфліктаў інтарэсаў

Канфлікт інтарэсаў уяўляе сабой супярэчнасць паміж інтарэсамі кліента_к адвакат_кі правоў чалавека (ў тым ліку былых), кліент_кі (ў тым ліку был_ой) і адвакат_кі правоў чалавека, адвакат_кі правоў чалавека і асацыяцыі, сябр_оўкай якой ён/яна з'яўляецца, паміж маёмаснымі і іншымі інтарэсамі адвакат_кі правоў чалавека.

Адвакат_ка правоў чалавека не павін_на дапускаць ўцягнутасці ў сітуацыю патэнцыйнага або рэальнага канфлікту інтарэсаў.

## 2.7. Кваліфікацыя і кампетэнтнасць

Адвакат_кі правоў чалавека адказныя за сваю кваліфікацыю, якую яны падтрымліваюць на працягу ўсёй сваёй дзейнасці, у тым ліку веданне імі прафесійных каштоўнасцяў і маральных абавязкаў, а таксама правоў чалавека і асноўных свабод, прызнаных нацыянальным і міжнародным правам.

Прымаючы на сябе абавязкі па аказанні кваліфікаваннай юрыдычнай дапамогі адвакат_ка правоў чалавека павін_на быць ўпэўнен_а, што яе/яго кампетэнтнасці і прафесіяналізму дастаткова для вырашэння задач, звязаных з аказаннем юрыдычнай дапамогі, у тым ліку з магчымасцю прыцягнення калег і эксперт_ак.

## 2.8. Асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

Рэалізуючы правы на свабоду асацыяцыі, адвакат_кі правоў чалавека могуць ствараць для абароны сваіх інтарэсаў і падтрымання высокіх стандартаў прафесіі свае прафесійныя асацыяцыі, якія дзейнічаюць на аснове прынцыпаў незалежнасці і дэмакратычнага самакіравання.

## 2.9. Павага правіл іншых калегій адвоката_ак і юрыдычных супольнасцяў

Адвакат_ка правоў чалавека павін_на з павагай ставіцца да правілаў нацыянальных калегій адвакат_ак, юрыдычных і праваабарончых супольнасцяў, якія дзейнічаюць на аснове павагі да правоў чалавека, а таксама прынцыпаў незалежнасці, самакіравання і самарэгулявання.

# 3. ЭТЫЧНЫЯ ПРАВІЛЫ БЕЛАРУСКАЙ АСАЦЫЯЦЫІ АДВАКАТАЎ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

## 3.1. Прынцыпы дзейнасці Беларусскай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека

Дзейнасць Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека ажыццяўляецца на аснове дадзеннага Кодэкса, Статута, іншых дакументаў, якія рэгламентуюць яе дзейнасць, зыходзячы з добраахвотнасці, агульнасці інтарэсаў, мэтаў і задач Асацыяцыі, павагі да правоў чалавека і прынцыпаў дэмакратычнага прыняцця рашэнняў.

Канфідэнцыяльнасць з’яўляецца нормай узаемадзеяння сябр_овак Асацыяцыі.

### 3.2. Сумяшчальнасць дзейнасці сябр_овак Асацыяцыі

Сябр_оўкі Асацыяцыі свабодныя ў ажыццяўленні імі аплатнай і безаплатнай дзейнасці, у тым ліку праваабарончай, прадпрымальніцкай, рамеснай, працай у дзяржаўных органах, міжнародных органах і арганізацыях, і іншай дзейнасці, калі яна не супярэчыць каштоўнасцям правоў чалавека, прынцыпам дзейнасці адвакат_кі правоў чалавека і інтарэсам Асацыяцыі.

Падчас выказвання свайго меркавання сябр_оўкі Асацыяцыі выступаюць ў прыватнай якасці, за выключэннем выпадкаў, калі яны былі упаўнаважаны Асацыяцыяй выступаць ад яе імя.

### 3.3. Камунікацыя паміж сябр_оўкамі Асацыяцыі

Узаемаадносіны сябро_вак Асацыяцыі будуюцца на даверы, павазе і салідарнасці, дзе кож_ная разумее сваю адказнасць як перед усёй супольнасцю адакатаў правоў чалавека, так і перад кож_най сябр_оўкай за дзейнасць, якую яна/ён выконвае ў галіне правоў чалавека.

Камунікацыя паміж сябр_оўкамі Асацыяцыі павінна весці да супрацоўніцтва, дапамагаць вырашэнню агульных пытаняў, развіццю супольнасці. Сябр_оўкі Асацыяцыі павіны імкнуцца пазбягаць канфліктаў.

### 3.4. Вырашэнне канфліктаў

Канфлікты на прафесійнай аснове і прыватныя паміж сябр_оўкамі Асацыяцыі павіны вырашацца выключна ў этычных формах камунікацыі і перамоў. Кожны бок канфлікта павінен пазбягаць ўцягвання ў канфлікт іншых сябр_овак.

Канфлікт і яго вырашэнне не павінны быць публічнымі. Нівод_ная з удзель_ніц канфлікту не павін_на даваць публічную ацэнку дзеянням і паводзінам другога боку канфлікта.

Для вырашэння канфлікту, які складана урэгуляваць уласнымі намаганнямі, пажадана звярнуцца да медыятар_кі.

### 3.5. Дапамога сябр_оўкам Асацыяцыі

Сябр_оўкі Асацыяцыі імкнуцца дапамагаць адно аднаму ў розных абставінах усімі магчымымі сродкамі.

### 3.8. Узаемадзеянне з грамадскай супольнасцю

Асацыяцыя і яе сябр_оўкі будуюць свае адносіны з іншымі адвакат_камі, праваабаронцамі, юрыст_камі, іх аб’яднаннямі і іншымі арганізацыямі грамадскай супольнасці ў адпаведнасці з прынцыпамі дзейнасці адвакат_ак правоў чалавека, добрасумленнасці і ўзаемапавагі.

**3.9. Узаемадзеянне з дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі і іншымі суб’ектамі**

Падчас узаемадзеяння з дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі і іншымі суб’ектамі сябр_оўка Асацыяцыі павін_на паводзіць сябе карэктна, прафесійна, у адпаведнасці з універсальнымі міжнароднымі стандартамі правоў чалавека і этычнымі правіламі дадзеннага Кодэкса.

Пры ўзаемадзеянні з іншымі суб’ектамі інтарэсы кліент_кі з’яўляюцца для сябр_оўкі Асацыяцыі прыярытэтнымі.

## 4. АДКАЗНАСЦЬ СЯБР_ОЎКІ АСАЦЫЯЦЫІ ЗА ПАРУШЭННЕ КОДЭКСА ЭТЫКІ

**4.1. Абавязак прытрымлівацца этычных паводзінаў**

Асобы, прынятыя ў адпаведнасці з працэдурай, предугледжанай Статутам Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека, у яе сябр_оўкі, абавязаны прытрымлівацца дадзенага Кодэкса. Сябр_оўкі Асацыяцыі прызнаюць кампетэнцыю Камісіі па этыцы па разглядзе пытанняў, звязаных з ужываннем і тлумачэннем Кодекса і па вынясенні рашэнняў у адпаведнасці з ім.

**4.2. Разгляд пытанняў, звязаных з выкананнем Кодэкса**

Пытанні, звязаныя з ужываннем, выкананнем і тлумачэннем дадзенага Кодэкса, разглядаюцца і вырашаюцца незалежнымі і бесстароннімі органамі, створанымі ў адпаведнасці са Статутам БААПЧ - Камісіяй па этыцы і Арбітражам па этыцы. Азначаныя пытанні разглядаюцца ў адпаведнасці з працэдурай, заснаванай на прынцыпах справядлівага разбіральніцтва, і падыходам, заснаваным на правах чалавека.

**4.3. Прыцягненне да дысцыплінарнай адказнасці**

Дысцыплінарная працэдура з’яўляецца важным і неабходным сродкам падтрымання высокіх стандартаў юрыдычнай прафесіі, умацавання яе незалежнасці і забеспячэння прынцыпа вяршэнства права, мае правамерныя мэты, сумяшчальныя з прытрымліваннем правоў чалавека, і не можа выкарыстоўвацца як сродак адвольнага ўмяшальніцтва ў дзейнасць адвакат_кі правоў чалавека і выключэння яе/яго з Асацыяцыі.

Парадак прыцягнення да дысцыплінарнай адказнасці і віды дысцыплінарных спагнанняў вызначаюцца Статутам Асацыяцыі.

Накладзенае спагнанне павінна быць неабходным і прапарцыйным учыненай правіне і не можа выкарыстоўвацца як сродак адвольнага ўмяшальніцтва ў дзейнасць сябр_оўкі Асацыяцыі і/або адвольнага выключэння яе/яго з Асацыяцыі.

### 4.4 Абскарджанне рашэння Камісіі па этыцы

Рашэнне, якім Камісія па этыцы прызнала парушэнне сябр_оўкай Асацыяцыі нормаў дадзенага Кодэкса, можа быць абскарджана сябр_оўкай Асацыяцыі на працягу аднаго месяца са дня атрымання рашэння ў Арбітраж па этыцы.

## 5. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Дадзены Кодэкс набывае моц з моманту яго прыняцця Агульным Сходам Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека.

Дзеянне этычных патрабаванняў, прадугледжаных пунктамі 2.4, 2.5 дадзенага Кодэкса, не абмяжоўваецца перыядам сяброўства ў Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека.

г. Вільнюс
8 снежня 2023 года

Упаўнамоцная Агульным Сходам
на падпісанне дадзенага Кодэкса
Прэзідэнтка Беларускай асацыяцыі
адвакатаў правоў чалавека ____________________ Марыя Колесава-Гудзіліна